# «СВЕТ ПАЭЗІІ ЯЎГЕНІІ ЯНІШЧЫЦ»

(75 год  з дня нараджэння беларускай паэтэсы Яўгеніі Янішчыц, 1948-1988 гг.)



Яўгенія Іосіфаўна Янішчыц — беларуская паэтэса, перакладчыца.

Нарадзілася Яўгенія Янішчыц 20 лістапада 1948 г. у в. Рудка Пінскага раёна Брэсцкай вобласці ў сялянскай сям'і. Сям'я жыла спачатку ў вёсцы Рудка, потым пабудавалі новы дом у вёсцы Велясніца.

Яўгенія напісала свой першы верш у 4-м класе і прысвяціла яго маці. Пасля заканчэння Рудкаўскай пачатковай школы вучылася спачатку ў Мерчыцкай васьмігодцы, а 9-10 класы скончыла ў Парэцкай сярэдняй школе (Пінскі раён). Атрымала педагагічную адукацыю, скончыла аддзяленне беларускай мовы і літаратуры БДУ.

Працавала загадчыцай бібліятэкі ЦК камсамола. Некаторы час жыла ў Чэхаславакіі, потым вярнулася на радзіму, займалася творчай працай. З 1976 г. Яўгенія Іосіфаўна была літкансультантам «Сельскай газеты», а з 1983 г. загадвала аддзелам паэзіі часопіса «Маладосць». Займалася яна і грамадскай дзейнасцю, удзельнічала ў якасці дэлегата XXXVI сесіі Генеральнай Асамблеі ААН.





Друкавацца Я. Янішчыц пачала ў Пінскай раённай газеце, яшчэ вучаніцай Парэцкай сярэдняй школы. Свае вершы будучая паэтэса падпісвала псеўданімамі Ж. Замяткіна, Е. Іосіфава.

Першыя пробы яе паэтычнага пяра заўважылі і ацанілі ў сярэдзіне 60-х крытыкі і чытачы. Падчас заканчэння школы і паступлення на вучобу ва ўніверсітэт яна мела ўжо публікацыі ў рэспубліканскіх перыядычных выданнях.




Першы зборнік вершаў маладой паэтэсы «Снежныя грамніцы» выйшаў у 1970 г. Кніга была вельмі добра прынятая, пра аўтара шмат і пахвальна пісалі. Многія вобразы «Снежных грамніц» сапраўды неслі ў сабе першародную свежасць юнацкага захаплення жыццём, закаханасць у родны край і яго людзей, адкрытасць перад светам надзей і спадзяванняў.

Імя паэтэсы хутка атрымала пэўную вядомасць, а яе творы друкаваліся не толькі ў беларускіх газетах, часопісах і калектыўных зборніках, але і ў рускіх цэнтральных выданнях, як «Маладая гвардыя», «Дружба народаў», «Літаратурная газета», «Праўда».

***

Хаджу па нівах, па лугах азёрных,
Начую летуценна ў будане
І думаю, чаму мне так прасторна?
І песня прылятае да мяне.

Прыносіць мне дары свае дуброва —
То верас, то крыніцу, то грыбок.
Ўліваецца, нібы ручай, у мову
Палескі нетаропкі гаварок.

Злятае па дасвецці галубіным
То рыжы ліст, то жоўта-залаты.
Упалі задуменна на платы
Даспелыя ружовыя рабіны.

Хаджу па нівах, па лугах азёрных,
Начую летуценна ў будане.
Я думаю, чаму мне так прасторна?
І песня прылятае да мяне.

## Вясновае

Горкі пах палыну,
Не зап'еш, не заснеш.
Забягу, загляну,
Як і чым ты жывеш.
Водар свята ў лясах,
Адступаецца снег.
Знаю, гэта вясна
Разбудзіла мяне.
І канчаецца сон
Бесклапотных начэй.
Маладых маіх дзён
Звоніць першы ручэй.

## Непрыручаная птушка

Мне па душы глухія пушчы,
Лістоты замець на дварэ.
Я непрыручанаю птушкай
Жыву між сполахаў і дрэў.
Каторы дзень настрой губляю
І зноў па-новаму люблю.
Бягу, гукаю, выглядаю,
Шукаю, думаю, ня сплю.
О, людзі! – Вечныя пытанні,
Вытокі мудрасці і зла.

Нясу ў сваё святое ранне
Любоў і гнеў на паўкрыла.
Мяне ў палёце не скарылі.
А будзе што не так – малю:
Скруціце стомленае крылле
І кіньце ў родную раллю.

Наступны зборнік «Дзень вечаровы» пабачыў свет у 1974 г., а ў 1978-м быў адзначаны прэміяй Ленінскага камсамола Беларусі. У кнізе пашыраюцца перспектывы, ўзбагачаецца вопыт, раскрываюцца новыя якасці лірычнага характару.






Этапным, паваротным прызналі крытыкі трэці зборнік вершаў Я. Янішчыц «Ясельда» ў 1978 г. Асаблівай пранізлівасцю ў кнізе адрозніваецца любоўная лірыка. Па-ранейшаму пяшчотная і надзвычай тонкая ў перадачы інтымнага пачуцці ва ўсёй яго супярэчлівасці і жывой рухомасці, любоўная лірыка нясе ў сабе больш, чым раней, горычы.

## Пралескі

Мне гэтак светла на душы,
Хоць і захмаран край палескі.
Але ў гліняным гладышы
Пагодныя ўзышлі пралескі.

Клапотна іх ля раўчука,
Дзе парыжэлыя сумёты,
Шукала матчына рука
На светлы дзень майго звароту.

Як свята хутка настае,
З плячэй гады зняла дарога.
Цвітуць настольнік на стале,
І падаконнік, і падлога.

Аб тым, што дзень ці два гасціць
І дыхаць тым паветрам свежым,
Сказаць баюся,
бы ўпусціць
Гладыш са шчасцем беласнежным.

***

Вузельчыкі званкоў
І росы на папасе.
Шчэ столькі вечароў
Харошых у запасе!
Няхай не размяняць
Ні сцежкі і ні долі.
Прыслухайся: шумяць
Жыты на вольным полі.

Прыслухайся:
яшчэ
Бяды не так і многа,
Калі ступню пячэ
Адкрытая дарога,
І сцелецца ў цішы
Сяброўская размова,
І спеліцца ў душы
Купалавае слова.

***

Цяплейшых промняў сонечныя стужкі
Ужо ў стажкі прыбрала сенажаць.
Вось шумна парассыпаліся птушкі,
Ці ўсе яны нанова празвіняць?
Ляжаць вакол багатыя загоны,
І бочкі мокнуць, каб прыняць дары,
Збіраецца для гэтага зялёны
Смарагдавы лісточак у двары.

Вартуе сонца важкія антоны,
Хтось прасушыць
паслаў льняны сувой.
І самай свежай выпечкі батоны
Чакае самы ранні сырадой.
Так светла і завозна у прыродзе!
Грыбною цішай дыхаюць бары...
І сумна, што гурмою на зыходзе
Вясёлыя у вёсцы шкаляры.

Сталасці майстэрства Я. Янішчыц дасягнула ў кнігах «На беразе пляча» (1980 г.), «Пара любові і жалю» (1983 г.), адзначанай у 1986 г. Дзяржаўнай прэміі Беларусі ім. Я. Купалы, «Каліна зімы» (1987 г.). Мысленне паэтэсы вызначаецца філасофскім роздумам над часам і прасторай, імгненнем і вечнасцю, жыццём і смерцю. Стан яе душы выяўляецца праз ўзаемазалежнасць такіх эмацыйных катэгорый, як каханне і боль, шчасце і адчай, радасць і смутак, святло і цемра.



***

Помню, помню праз гады,
Спеўная ваколіца:
«Выпі, золатца, вады,
Сэрца супакоіцца».

Да крынічнай, спакайной –
Сцежкі-птушкі вольныя.
Трыццаць вёснаў за спіной,
А ці ўсе спакойныя?

Мне дарогі не пытаць,
Сонейка высокага.
А як жа стану суцяшаць
Ў горы сябра-сокала?

Ды, вядома, як тады
Ты мяне, ваколіца:
«Выпі, золатца, вады,
Сэрца супакоіцца».

**Паэтэса**

Яна раптоўнаму куплету
Здзівілася упершыню,
І захацелася ў паэты,
Нібыта птушцы ўвышыню.

Яна так лёгка улавіла
Рытмічны строй і рыфмы код.
Рыфмуе: «мілы – да магілы»
Ў няпоўных васемнаццаць год.

Дыктуе дзень на ўлонні лета
Ёй пра палі ды сенажаць.
...Дзяўчынцы хочацца ў паэты,
Што ў катаржанкі, – дзе ж ёй знаць?!

Вось са сваім адкрытым светам
Яна бяжыць праз сенакос.
Дзяўчынцы хочацца ў паэты...
О дай апомніцца ёй, лёс!

***

Чым пачыналася яна,
Дарожная аповесць,
Чыя была у ёй віна,
Чыя гучала споведзь?

Была святочнай далячынь,
Як за вакенцам – ранне,
Як на маім зямным плячы –
Цяпло твайго дыхання.

Ірваліся істужкі рэк
Пад сховай апаўночы.
Былі на міг, а ці на век
Вачам адкрыты вочы...

Запомніць праз туман-імжу
Кароткую аповесьць,
Нібы на нітачцы дажджу –
Сярэбраную споведзь.

Звярталася Яўгенія Іосіфаўна і да прозы, напісала некалькі апавяданняў, рэалістычных па сваёй фактуры і сапраўдных па сутнасці («Кошык бульбы», «Сардэчнасць», «А я ўсіх шкадую» і інш.). Плённа працавала паэтэса ў галіне мастацкага перакладу, узнаўляючы па-беларуску вершы рускіх і ўкраінскіх паэтаў. Публікаваліся ў друкаваных выданнях яе артыкулы пра паэзію, глыбокія рэцэнзіі на паэтычныя кнігі, водгукі з падрабязным аналізам твораў.



У апошняй прыжыццёвай кнізе «У шуме жытняга святла» (1988 г.) сабрана лепшае з напісанага за дваццаць гадоў літаратурнай працы. Пасля гэтай кнігі творы Я. Янішчыц пачалі прыходзіць да чытача ў выглядзе паэтычнай спадчыны. У 2000 г. выйшла кніга «Выбранае», а ў 2008 г. – «Пачынаецца ўсё з кахання...», куды ўвайшло лепшае з напісанага паэтэсай.



Я 626 у. ш.
Янішчыц, Я.
У шуме жытняга святла : вершы, паэма / Я. Янішчыц. – Мінск : Мастацкая літ., 1988. – 414 с.




Яўгенія Янішчыц сваімі арыгінальнымі, рамантычна-ўзвышанымі і ў той жа час задушэўна-інтымнымі вершамі даўно вядома шырокаму колу чытачоў. Тонка адчуваючы сваю кроўную сувязь з роднай зямлёй, паэтэса ўражвае глыбінёй асэнсавання складаных праблем сучаснасці, прагай сцвярджэння высокачалавечых адносін паміж людзьмі.

У кнігу ўвайшло лепшае з напісанага паэтэсай за дваццаць гадоў плённай працы ў нашай паэзіі.

# «СВЕТ ПАЭЗІІ ЯЎГЕНІІ ЯНІШЧЫЦ»

(75 год  з дня нараджэння беларускай паэтэсы Яўгеніі Янішчыц, 1948-1988 гг.)

Віртуальную выставу падрыхтавала бібліятэкар 2-й катэгорыі Лапцева Л. Д.